# Наконт „нацыянал-бальшавізму" Міколы Шэляговіча

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 9M64(3a)

У газеце „Советская Белоруссия" (№ 247, 25 XII. 91 года) быў змешчан артыкул старшыні кіраўніцтва „грамадзянска-культурнага аб'яднання" „Палессе" пад назвай: „Бальшэвізм не памёр ён толькі памяняў імя на нацыянальнае", у якім аўтар выказвае свой погляд на нацыянальнае пытанне ў Беларусі і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні.

Астанаўлюся на пытаннях, якія падымае аўтар па ходу гэтага артыкула.

М. Шэляговіч супраць таго, што „на Беларусі можа быць толькі беларуская ўлада" (ЛіМ ад 13.12.1991 г.).

Беларусь ня меньш нацыянальная дзяржава, чым, напрыклад, Францыя, Данія, Польшча, Балгарыя, Японія і г.д., дзе адпаведна ўлада французская, датчанская, польская, балгарская, японская і г.д., хоця ў ўсіх гэтых, і іншых, дзяржавах пражываюць, акрамя карэннай нацыі, і другія нацыянальныя этнасы — меньшасці.

vytoki.net

Не трэба путаць беларускую ўладу з уладай беларусаў. Само сабой разумеецца, што беларускую ўладу ў РБ павінны мець магчымасць ажыццяўляць і прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў. Цяпер, як вядома, у РБ ў Вярхоўным Савеце (парламенце) большасць небеларусаў. Гэта было б нестрашна, каб яны працавалі на адраджэнне Беларусі і ўсе сумленна працавалі на карысць яе народаў. На жаль, многія із іх нават на паседжанне парламента не з'яўляюцца. Лічу, што ў будучым прадстаўніцтва ў парламенце Р.Б павінна быць прапарцыянальным ад колькасці насельніцтва розных нацыянальнасцяў пражываючых у Беларусі.

М. Шаляговіч заклапочаны, што ў Беларусі „на змену марксісцка-ленінскаму бальшавізму прыйшоў беларускі нацыянальны бальшавізм", пад якім ён падразумевае улада беларускай большасці над нацыянальнымі меншасцямі нашай краіны. Але ж такога насілля не было за ўсю гісторыю Беларусі. Трэба адзначыць, што на Беларусі правовая дзяржава была створана больш як 400 гадоў таму назад, у якой ні адна

нацыянальная меншасць не была пакрыўджана беларусамі. Няма гэтага і цяпер. Упэўнены, што такога гвалту не будзе і ў будучым.

Праўда, у сваім артыкуле аўтар ні слова не сказаў як прыгодзілі беларусаў іх „вызваліцелі", як татальным маштабам адымалася і абескубвалася тэрыторыя, праводзілася планамернае змяненне па нацыянальнаму саставу насельніцтва, насаджэнне польскага і рускага языкоў, штучнага змянення этнаса, пра больш у 4 разы надатак у беларускім краі, чым у Расеі пры імператарах і што пачынаючы з 50-х гадоў із Беларусіі у агульнасаюзны цэнтр выкачывалася на 40% прадукцыі больш, чым із РСФСР із разліку на душу насельніцтва.

М. Шаляговіч выказвае абіду, што у Беларусі пасля звяржэння камуністычнага бальшэвізма рашчышчана места для беларускай нацыянальнай ідэялогіі. А вось заходнепалескія, польскія, рускія і рускаязычныя і іншыя атрымалі мінімум жаданага.

А паглядзіце як дбаюць абстаноўцы у сваім уласным доме аўтахтонныя (карэнныя) нацыі усе нацыянальныя

vytoki.net

дзяржавы. У Беларусі нацыя "бальшэвік" да гэтага часу застаецца ў загоне. Беларусы - гэта "бяздомнікі" у уласным доме, дзе пераважаюць чужыя людзі, чужыя ідэалы, чужыя каштоўнасці па-ранейшаму правяць баль і задаюць моду. Няма на Свеце другой нацыянальнай дзяржавы, акрамя Беларусі, дзе бы нацыя-"бальшэвік" вучылася, малілася і размаўляла на мове чужой дзяржавы. Можа беларусам лепш жывецца хоць бы ў Польшчы ці Расіі, чым палякам і рускім у Беларусі? Вядома, што на Беласточчыне, дзе беларусы жывуць на сваёй этнічнай тэрыторыі, у 1990 годзе палякамі было спалена 6 праваслаўных цэркваў і забіты 2 праваслаўныя святары. У Расіі ніколі нічога не рабілася для развіцця мовы і культуры пражываючага там беларускага этнаса.

Ды і ў самой РБ нацыі-меншавікі дбаюць толькі аб сваіх інтарэсах і ніколькі аб інтарэсах нацыі "бальшэвіка" (беларусаў).

Што датычыць заходне-палескага этнаса і края. Гэты ізвечна беларускі люд і край М. Шэляговіч габоў

выдзяліць у своеасаблівую „Крайня-стродоўскую рэспубліку", напэўна у галаве з'ім самім. Але ж з няменшай асновай" можна было б выдзяліць у „суверэнную рэспубліку", напрыклад, і Полаччыну, на зямлі якой яшчэ у старажытныя часы ужо была рэспубліка. Гэта край сусветна вядомай старажытнай культуры. Ёсць і моўныя асаблівасці. Тут сяляне не у печах мыюцца, а у уласных лазнях.

У кожнай нацыі ёсць і этнічныя групы з іх асаблівасцямі. Заходнія палешукі і палачане - гэта беларусы са сваімі этнічнымі асаблівасцямі.

М. Шалятовіч лічыць, што беларусы не маюць права быць гаспадарамі у уласным доме, таму што „валяй выпадкаі тэрыторыя рэспублікі названа „Беларусь" і яна „не ад стварэння Света".

А як жа другія нацыянальныя краіны, няўжо ад стварэння Света"?! Кожны народ хоча быць сам гаспадаром у сваім уласным доме. Што датычыць жыхароў нацыянальных меншасцяў, дык у Беларусі ім жылося і жывецца, як і ўся грамад

vytoki.net

а часцей нават лепш, чым самім адвечным гаспадарам свайго уласнага дома, чым жылося нацыянальным меншасцям у рэспубліках былога Саюза, жылося і жывецца у другіх краінах свету. Невыпадкова у Беларусь ахвотна заставаюцца небеларусы-вайскоўцы, выйшаўшыя на пенсію, перасяляюцца із іншых былых рэспублік і ніхто адсюль ня вельмі хоча вяртацца на сваю этнічную радзіму. Дзякуй Богу у Беларусі нацыянальны мір, хаця інтарэсы беларусаў дзесяцігоддзямі і стагоддзямі былі ушчэмляны. Ды і цяпер ёсць людзі, якія хочуць каб беларусы кармілі хлебам-малаком-мясам чужынцаў за пічканке іх чужымі гонарам і славай. Але гэтыя часы ужо прайшлі.

М. Шэляговіч лічыць, што жыхароў Заходняга Палесся, якіх ён не адносіць к беларусам, „гвалцяць чужой беларускай мовай" у імя „нацыянал-бальшэвізма" — нацыянальнага беларускага адраджэння. Для заходніх палешукоў ён патрабуе захаваць рускую мову,

vytoki.net

а беларусам, размаўляючым на-руску, даць свабодна эвалюцыянізіраваць па законах сваёй прыроды.

Ніхто нікому у РБ не забараняе карыстацца сваёй мовай у тым ліку і дыялектамі. Але дзяржаўную мову лічу, што павінны знаць усе, а яна у нас зяўляецца літаратурная беларуская мова.

Шаноўны М. Шэляговіч ня можа ня ведаць як „свабодна давалі эвалюцыянізіраваць па законах сваёй прыроды" беларусам іх „вызваліцелі". Ва ўсіх дзяржавах, перш за усе сама дзяржава дбае аб мовах свайго народа, развіцці яго нацыянальнай свядомасці, культуры і г.д. Ва ўсіх дзяржавах законы аб дзяржаўных мовах выконваюцца строга. Ні ў адной краіне, акрамя РБ, не уладкуецца на дзяржаўную працу, ня ведаючы дзяржаўнай мовы.

М. Шэляговіч патрабуе каб і заходнепалескі дыялект таксама быў прыняты за дзяржаўную мову у РБ. Ва ўсіх краін… есць і дыялекты дзяржаўных моў, ал… нігдзе дзяржаўнай мовай яны не прынятыя. Гэта проста немагчыма.

vytoki.net

Аўтар піша: „Сагласімся, што па-лякам яўляецца той, хто ім сябе лічыць".

Сагласіцца з гэтым нельга. Прынцып самавызначэння нацыянальнай прыналежнасці вельмі недасканалы, а для Беларусі — асабліва. Прывяду прыклад із уласнай радні і сям'і. Мой дзед і яго тры браты былі карэннымі беларусамі, праваслаўнымі. Дзед ажаніўся на карэннай беларусцы-каталічцы із суседняй вёскі. Каб не святкаваць у сялянскай сям'і 2 разы адны і тыя ж святы, ён перайшоў у каталіцкую веру. Сын яго і шэсцера дзецей сына, у тым ліку і я. Такім чынам мы сталі каталікамі. А палякі цяпер нас афіцыйна запісвалі ўжо палякамі. Ужо пры савецкай уладзе 5-х із нас у пашпартах запісалі беларусамі, а адну сястру — полькай на той аснове, што пашпарт яна атрымлівала на касцёльнай метрыцы, напісанай на польскай мове.
Такіх выпадкаў „нацыянальнага самавызначэння" у Беларусі тысячы.

vytoki.net

Прынцып самавызначэння нацыянальнай прыналежнасці можа насіць і кан'юнктурны характар, што часта назіраецца сярод жыдоў.

У мяне на кафедры працавала пяць выкладчыкаў-жыдоў, якія, аднак, пісаліся беларусамі, украінцамі, рускімі. Адна із іх асістэнтка была вырашыла выехаць у Ізраіль і змяніла сваю „рускую" кашкартную нацыянальнасць на сапраўдна-жыдоўскую і выехала, сказаўшы пры гэтым: „Я прадпачытаю тую нацыянальнасць з якой лягчэй жыць."

Свабодным можа быць выбар толька грамадзянства. Ўадпаведнасці з міжнароднымі законамі, правіламі ААН, аб правах чалавека кожны пры жаданні можа змяніць месца пражывання і адпаведна грамадзянства, але не нацыянальнасць. Самавольнае, гвалтоўнае, штучнае змяненне нацыянальнасці, асабліва масавае, можа прывесці к міжнацыянальным, а то і к міжнародным канфліктам, таму што гэта звязана са змяненнем граніц

vytoki.net

і навогул адтаржэннем тэрыторый. Акрамя таго, гэта можа прывесці к неразуменню асобных краін па эканамічных прычынах. Вось чаму пытанне нацыянальнай прыналежнасці павінна вырашацца не па асабістаму жаданню апытуемага, а па сапраўднаму яго паходжанню.

Лічу, што абавязак нашай беларускай дзяржавы сапраўдную нацыянальную прыналежнасць сваіх грамадзян і веравызнанне у гэтай справе не можа быць крытэрыем нацыянальнай прыналежнасці.

М. Шэляговіч піша: „Місія праднaзначэння кусочка Зямлі па імені Беларусь у прошлым ніколі не заключалася у утвярэнні на ім аднаго народа, аднэй мовы, аднэй ідэалогіі ці культуры. Гэта тэрыторыя ізвечна была месцам сагласавання сінтэза разных народаў, языкоў, ідэалогій, культур".

Гэта не адпавядае гістарычнай праўдзе. Агульнавядома, што аўтахтонамі гэтага „кусочка Зямлі" па імені Беларусь былі і ёсць беларусы. Астальныя (татары, палякі, расійцы,

vytoki.net

украінцы і др. на ім аказаліся у выніку захопніцкіх войн, палітычныя і эканамічных абставін, мігранты

Вялікае княства Літоўскае этнічна было беларускім а Жэмайція (цяперашняя Літва) уваходзіла у склад яго як аўтаномнае княства. Дзяржаўнай мовай была старабеларуская мова, яно мела багатую культуру, самую дэмакратычную у тыя часы ідэалогію. Аднак, шматгадовая залежнасць края ад Польшы і Расеі прывела к сумным вынікам. Трудна назваць другі народ, так доўга і цяжка эканамічна прыгнечаны, нярэдка пры удзеле сваёй жа пераражджэнай арыстакратыі і канфармістаў із асяроддзя інтэлігенцыі. Многія выдатнейшыя беларускія дзеячы літаратуры, мастацтва, культуры, навукі аказаліся вымушанымі тварыць не на роднай мове, а замежную і жыць не на роднай зямлі, абагачаючы другія культуры, часам не падазраючы аб

сваім беларускім паходжанні, атая-
самляючы сваю нацыянальнасць з гра-
мадзянствам той дзяржавы, пад
уладай каторай яны знаходзіліся
(пад польскай - паляк, пад рускай -
рускі). Прыгнечанне ўсяго нацы-
янальнага прывяло к рассяленню
народа па языку, культуры, рэ-
лігіі, ідэялогіі, менавіта таму,
што чужымі ўладамі гвалтоўна
насаджаліся свае мова, культура,
ідэялогія.

М. Шэляговіч абвінавачвае ня-
ведама каго у „Беларускім на-
цыянальным сіндроме". Нажаль,
яго яшчэ няма, таму і адраджэн-
не беларускага народа ідзе вельмі
туга, марудна, як выздараўленне
цяжкага хранічнага хворага.

Ён прапануе зрабіць дзяржаўнай
мовай ў Беларусі, нараўне з бела-
рускай, і заходнепалескі дыялект,
польскую і рускую мову - мовы
галоўных, самых шматлікіх на-
родаў, чамусці забыўшы пра

украінцаў, якіх у Беларусі пражывае больш, чым палякаў.

2) пераўтварыць РБ у край сваім адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаваннем падобны на Швейцарыю, у каторым будзе і беларускі кантон, заходне-польскі і польскі... Тым і рускаму і рускаязычнаму насельніцтву таксама будзе утульна жыць (ім кантоны ёй не вызначае). Акрамя без кантонаў украінцы, жыды, маглі б быць этнасы. Тут М. Шэляговіч чысцейшы „бальшавік".

Можна знайсці адну, ну дзьве дзяржаўныя мовы, а 3-5 проста немагчыма ввучыць. Многа дзяржаўных моў няма ні ў адной нацыянальнай краіне. Нават у такой многанацыянальнай краіне, як США толька адна дзяржаўная мова - ангельская.

Што датычыць дзялення Беларусі на нацыянальныя кантоны па тыпу Швейцарыі.

vytoki.net

Швейцарская канфэдэрацыя ўтво-
рана із краін (краёў), на якіх
аўтахтонна пражывалі нем-
цы, французы, італьянцы — зусім
розныя народы, „прыйшоўшыя" ў
канфэдэрацыю" са сваёй нацы-
янальнай тэрыторыяй. Ўскла-
дзе РБ няма чужых этнічных
тэрыторый. Наадварот, у вы-
ніку бальшэвіцкага перадзела Бе-
ларусь страціла свае ісконныя
землі на Смаленшчыне, Бела-
сточчыне, Браншчыне, Дзвіншчыне,
Віленшчыне. Вось там і зрабіць
бы беларускія кантоны, але
чамусьці не чуваць каб нашыя су-
седзі сабіраліся рабіць у сябе
такія тэрытарыяльна-адміні-
страцыйныя пераўтварэнні, а
дзяржаўнай мовай зрабіць і бе-
ларускую мову.

Якім бы не быў М. Шэляговіч
патрыёт заходняга Палесся, але
выдзяляць гэты край у нацыяналь-
ную краіну (кантон) няма ніякіх
падстаў, як і Полаччыну, абвышля

vytoki.net

ужо гаварыў вышэй. Падобных кантонаў няма ні ў адной краіне. Сэпаратызм нацый на этнічныя групы шкодны для яе народа і дзяржавы. Этнічныя групы нацыі задоўгія стагоддзя кансалідаваліся ў крэўкую адзіную нацыю.

Іван Міроньчык

адаслана ў „НГ" 16.I.92г.

vytoki.net